УДК 908:06(476)«1930»

**А. У. Дзянісаў**, кандыдат гістарычных навук, асістэнт (БДТУ)

# ГЕНЕЗІС НАПРАМКАЎ АРГАНІЗАЦЫЙНАЙ І ДАСЛЕДЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ КРАЯЗНАЎЧЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ Ў ПАЧАТКУ 1930-Х ГГ. У БССР НА ПРЫКЛАДЗЕ ВЫВУЧЭННЯ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА

Публікацыя закранае тэму дзейнасці краязнаўчых арганізацый ў пачатку 1930-х гг. пад кіраўніцтвам Цэнтральнага бюро краязнаўства БССР. Разглядаецца генезіс напрамкаў арганізацыйнай і даследчай дзейнасці краязнаўчых арганізацый ў перыяд актыўнага будаўніцтва сацыялістычнага грамадства, ідэалагічнага ўціску на навуковую, сацыяльна-палітычную і культурную сферы жыцця БССР. У сувязі з распачатымі кампаніямі па калектывізацыі сельскай гаспадаркі і індустрыялізацыі прамысловасці Савецкай Беларусі краязнаўчы рух быў накіраваны на актыўны ўдзел у вывучэнні іх вынікаў і агітацыйна-прапагандысцкай працы.

The article examines the genesis of organizational direction and research of local history organizations of the BSSR in the early 30-s of XX century. In the modern Belarusian historical science theme of local history of Socialist Society 1930-th is not investigated. Nevertheless, this issue remains unexplored to the present. Local history organization of the Soviet of Belarus in the early 1930-s has been active for the Study of the productive forces of the country, at first the collectivization of agriculture, industrial production and nature's resources. Historians have been studying the success of collectivization on the ground, cooperate with local communities, regional authorities and research institutions. If in 1920 the subject of study for local history organizations had a history, culture, ethnography and folklore, in 1930. historians have been studying natural resources of the region. Local history in this period were heavily exposed Soviet ideology. However, we should not forget the achievements of local lore, great organizational and research work that was done during this period. On the other hand, we should recognize that the work of local historians BSSR not have an absolute success. The reason for this was the political terror of 1930, a lack of funds and human resources.

**Уводзіны.** У гісторыі Беларусі 20–30-х гг. XX ст. краязнаўчы рух, актыўная дзейнасць краязнаўцаў Савецкай Беларусі атаясамліваюцца ў асноўным з дасягненнямі ў вывучэнні гісторыі, культуры, фальклору і этнаграфіі беларускага краю. Разам з тым краязнаўчыя таварыствы зрабілі вялікі ўклад у даследаванне прыродных багаццяў Беларусі, флоры і фаўны, эканамічных магчымасцей тэрыторыі. Займаліся краязнаўчыя таварыствы і вывучэннем сельскай гаспадаркі і прамысловасці БССР. Пры гэтым вывучэннем не толькі яе гістарычных аспектаў, але і сучаснага ім развіцця. Найбольш актыўнае вывучэнне праходзіла ў пачатку 1930-х гг., калі краязнаўчы рух Беларусі быў уцягнуты ў шматлікія масавыя кампаніі: калектывізацыя сельскай гаспадаркі, індустрыялізацыя, барацьба з недахопамі, з рэлігіяй і царквой, выкрыццё і крытыка «нацыянал-дэмакратызму». Канешне, мы павінны растлумачыць, што ў савецкім грамадстве пад вывучэннем сацыялістычнай рэчаіснасці разумелася поўнае ўваходжанне суб'ета ў аб'ект, ліквідацыя дыстанцыі. Іншымі словамі, *краязнаўцы павінны былі вывучаць сацыялістычнае будаўніцтва праз непасрэдны ўдзел у гэтых працэсах.*

Генезіс краязнаўчага руху ў БССР пачаўся ў 1920 г., калі ў добраахвотных краязнаўчых таварыствах з'явілася магчымасць легалізаваць сваю даследчую дзейнасць. У 1924 г. пры Інбелкульце было створана Цэнтральнае бюро краязнаўства (далей – ЦБК), якое ажыццяўляла кіраўніцтва ўсёй краязнаўчай працай рэспублікі. У 1928 г. краязнаўчы рух БССР набыў масавы характар (каля 10 000 членаў краязнаўчых арганізацый па ўсёй рэспубліцы). Карысць у дзейнасці краязнаўчых таварystваў прызнавала і кіраўніцтва рэспублікі, якое імкнулася аказваць ім пасільную падтрымку.

**Асноўная частка.** Першыя спробы пераарыентаваць краязнаўчы рух на даследаванне вынікаў сацыялістычнага будаўніцтва былі распачаты ў 1929 г., які быў адзначаны далейшым узмацненнем камандных метадаў кіраўніцтва эканомікай. На першае месца былі выведзены абавязковы дзяржаўны план, павышаныя вытворчыя заданні, жорсткая цэнтралізацыя кіравання.

У гэтых умовах у дзейнасці ўсёй Беларускай Акадэміі навук (далей – БАН) і ЦБК прынцыпы вывучэння вытворчых сіл, асвятленне поспехаў сацыялістычнага будаўніцтва і яго галоўных дасягненняў – калектывізацыі і індустрыялізацыі, – выходзяць на першы план. «Гэтаму "аграмаджванню" сялянскай гаспадаркі, будаўніцтву па магчымасці буйных калгасаў (і саўгасаў) нашы краязнаўчыя арганізацыі павінны дапамагчы ў максімальнай меры, і гэта тым больш патрэбна, што да гэтага часу мы яшчэ не вывучалі належным чынам нашага калгаснага

будаўніцтва, рост якога адбываўся досыць стыхійна. Роля краязнаўчых арганізацый – навукова і ў папулярнай форме паказаць селяніну перавагу вядзення буйной гаспадаркі над гаспадаркай дробнай», – адзначаў сакратар ЦБК В. Самцэвіч у артыкуле «Бліжэйшыя задачы краязнаўчай працы ў сувязі з выкананнем пяцігадовага плана сацыялістычнага будаўніцтва» [1, с. 6].

На Трэцяй Усебеларускай краязнаўчай канферэнцыі, якая адбылася 25–26 студзеня 1930 г., ЦБК было прапанавана прыняць усе неабходныя меры па пераводзе краязнаўчай сеткі на новы напрамак, у бок арганізацыі вытворчага краязнаўства.

Прынятая пленумам Трэцяй Усебеларускай краязнаўчай канферэнцыі рэзалюцыя прадпісвала ЦБК прыняць ўсе неабходныя меры па пераводзе краязнаўчай сеткі на новы напрамак, у бок арганізацыі вытворчага краязнаўства. Сярод галоўных пытанняў, якія павінны даследаваць краязнаўцы, вылучаюцца наступныя: індустрыялізацыя краіны, вывучэнне энергетычных рэсурсаў, вывучэнне калгасаў, калгаснага руху, павышэнне вытворчасці сельскай гаспадаркі, эканамічнага стану раёна, вытворчых прыродных сіл, рэвалюцыйнага, антырэлігійнага руху і інш. ЦБК павінна было дамовіцца з народным камісарыятам асветы аб вызначэнні пэўнага зместу і форм школьна-краязнаўчай працы, краязнаўчыя арганізацыі былі заклікаными да актыўнага ўдзелу ў сацыялістычных спаборніцтвах, трохмесячніках беларускай сацыялістычнай культуры, культуры нацменшасцей і інш. [2, с. 34].

З канца 1930 г. вывучэнне вытворчых сіл краю[1], калектывізацыя сельскай гаспадаркі пачынаюць займаць галоўнае месца сярод накірункаў дзейнасці краязнаўцаў. ЦБК працягвала прымаць удзел у сацспаборніцтвах  і кампаніях [2, арк. 355]. У пачатку 1931 г. быў складзены і зацверджаны прыкладны гадавы план працы раённых таварыстваў краязнаўства. Пры складанні яго за ўзор быў ўзяты план працы ЦБК, распрацаваны ў канцы 1930 г. Раённыя краязнаўчыя таварыствы павінны былі сумесна з мясцовымі органамі праверыць склад членаў таварыстваў і гурткоў з мэтай ачысткі ад нацыянал-дэмакратычных элементаў, арганізаваць краязнаўчыя гурткі (ячэйкі) на ўсіх вытворчых прадпрыемствах: фабрыках, заводах, калгасах і саўгасах, правесці падрыхтоўку новых краязнаўчых кадраў з асяродку рабочых, калгаснікаў і саўгаснікаў, разгарнуць сацспаборніцтва і ўдарную працу сярод краязнаўчых арганізацый, прымаць актыўны ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве, выбарах мясцовых саветаў, супрацоўнічаць з часцямі Чырвонай Арміі, гаспадарчымі ўстановамі, органамі ўлады з мэтай выпрацавання сумеснай тактыкі прац і інш.

Раённыя таварыствы павінны былі за 1931 г. правесці вывучэнне рацыяналізацыі вытворчасці, сацспаборніцтва і ўдарнай працы, арганізаваць даследчыя экспедыцыі па вывучэнні глеб, раслін, карысных выкапняў, прадпрыемстваў, форм калектыўнай гаспадаркі і інш. Краязнаўчыя ячэйкі павінны былі дзейнічаць непасрэдна ў саўгасах і калгасах, адзначаць поспехі і недахопы калектывізацыі, прыярытэт і эфектыўнасць калектыўнага спосабу арганізацыі сельскай гаспадаркі над усімі астатнімі, разгарнуць крытыку так званых «шкодных» элементаў вёскі. У планах раённага краязнаўчага бюро на 1932 г. прадугледжвалася даць сацыяльна-эканамічнае апісанне свайго раёна, прыняць удзел у павышэнні ўраджайнасці і скласці манаграфічнае комплекснае апісанне як мінімум аднаго калгаса.

Таксама краязнаўчая праца прадугледжвала масавае ўцягванне мясцовага насельніцтва ў вывучэнне аб'ектаў сацыялістычнага будаўніцтва. У вывучэнні калгасаў і саўгасаў планавалася ўцягнуць каля 80% усяго працаздольнага насельніцтва кожнага раёна БССР да 1933 г. [3, арк. 12–14].

У 1932 г. свет убачыў зборнік «Аб становішчы арганізацыі працы ў калгасах БССР». Даныя былі сабраны ў выніку абследавання 40 калгасаў БССР у 1931 г. У ім адзначаўся стан калектывізацыі, поспехі і недахопы працы калгасаў, тэмпы калектывізацыі і інш. [4].

ЦБК актыўна дзейнічалі ў сферы распрацоўкі методыкі даследавання. Усяго за 1931–1932 гг. ЦБК сумесна з Масавым сектарам і інстытутамі БАН было выдадзена каля 15 брашур метадычнага характару. Сярод іх: «Вывучай калгас» В. Серафімава, «Зрухі і задачы санітарнага аздараўлення вёскі ў сувязі з яе сацыялістычнай рэканструкцыяй» доктара З. Магілеўчыка, «Праграма па вывучэнні глеб Беларусі» П. Рагавога, інш. Асаблівай актыўнасцю вылучалася дзейнасць намесніка старшыні ЦБК, ветэрана краязнаўчага руху В. Самцэвіча. У сваіх манаграфіях «Як арганізаваць манаграфічнае апісанне раёна», «Як арганізаваць вывучэнне калгасаў», «Праграма школьна-краязнаўчага вывучэння саўгаса», у шматлікіх артыкулах

[1] *Пад «вытворчымі сіламі» у 1930-х гг. у савецкім грамадстве разумеліся асноўныя элементы эканамічнага патэнцыялу (прыродныя, людскія, створаныя чалавекам рэсурсы, тэхнічныя сродкі, каштоўнасці, запасы, магчымыя крыніцы прыбытку), якія выкарыстоўваюць для дасягнення канкрэтных мэт эканамічнага і сацыяльнага развіцця. Усе вытворчыя сілы павінны былі выкарыстоўвацца для паскарэння тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР.*

у часопісе «Савецкая краіна» ён правёў велізарную працу, накіраваную на наладжванне новай навукова-даследчай краязнаўчай дзейнасці і папулярызацыю савецкага краязнаўства сярод працоўнага насельніцтва ў новых умовах [5, арк. 22].

Разам з тым праца краязнаўчых бюро і ячэек на месцах, тэмпы і маштабы дзейнасці па вывучэнні вытворчых сіл, калектывізацыі сельскай гаспадаркі, ідэалагічнай працы не задаволілі як мясцовае, так і вышэйшае кіраўніцтва рэспублікі [6, с. 113]. Да пачатку 1933 г. на тэрыторыі БССР дзейнічала каля 60 краязнаўчых арганізацый, якія вывучалі прадпрыемствы, калгасы і саўгасы. Планы па масавым уцягванні ў краязнаўчую працу мясцовага працоўнага насельніцтва таксама не былі рэалізаваны [7, с. 79]. Як вынік, з 1933 г. краязнаўчай працы пачынае надавацца менш увагі, спыняе дзейнасць часопіс «Савецкая краіна», а з 1935 г. – краязнаўчая праца ў БССР пачынае згортвацца.

**Заключэнне.** Такім чынам, абапіраючыся на дакладныя даныя гэтага даследавання, можна зрабіць наступныя высновы. Арганізацыйная і даследчая праца краязнаўчага руху Савецкай Беларусі ў пачатку 1930-х гг. істотна змянілася. Сярод асноўных напрамкаў было вызначана вывучэнне вытворчых сіл краіны, актыўны ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве і яго шматлікіх кампаніях. Асноўны ўпор рабіўся на арганізацыю масавай даследчай працы непасрэдна на прадпрыемствах і аб’ектах калектыўнай гаспадаркі з ўцягваннем мясцовага працоўнага насельніцтва. Краязнаўчыя арганізацыі павінны былі абапірацца на дапамогу мясцовых органаў улады, а таксама і навуковых арганізацый. З 1930 па 1933 г. ЦБК была праведзена вялікая праца па стварэнні навукова-метадычнай базы для даследавання вытворчых сіл краіны. Разам з тым краязнаўцы на месцах сутыкнуліся з пэўнымі цяжкасцямі матэрыяльна-тэхнічнага характару (недахоп сродкаў, людскіх рэсурсаў, рэальнай дапамогі мясцовых улад). Нягледзячы на гэта, краязнаўчыя арганізацыі БССР прынялі актыўны ўдзел амаль ва ўсіх кампаніях, значана садзейнічалі іх папулярызацыі. З іншага боку, трэба адзначыць, што ўдзел гэты быў вымушаны, а некаторыя дасягненні былі ў асноўным фармальнымі.

Галоўнай перашкодай для вывучэння вытворчых сіл краіны і больш актыўнага прыняцця ўдзелу ў сацыялістычным будаўніцтве было, на нашу думку, тое, што адначасова з рэарганізацыйнай і метадычнай пераарыентацыяй краязнаўчага руху пачалася кампанія па выкрыцці т. зв. «нацыянал-дэмакратызму» ў краязнаўстве. У выніку чаго шмат актыўных дзеячаў краязнаўчага руху былі арыштаваны, а краязнаўчыя таварыствы прыпынілі сваю дзейнасць.

## Літаратура


1. Самцэвіч, В. Бліжэйшыя задачы краязнаўчай працы / В. Самцэвіч // Наш край. – 1929. – № 8–9. – С. 3–7.
2. Вынікі Трэцяй Усебеларускай краязнаўчай канферэнцыі // Наш край. – 1930. – № 3. – С. 34.
3. Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці (ДАМВ). – Фонд. 328. – Воп. 1. – Спр. 12. Логойский районный отдел народного образования. Мероприятия по развертыванию краеведческой деятельности. Постановление СНК от 01. 06. 1932 г. – 16 л.
4. Фішар, Н. Аб становішчы арганізацыі працы ў калгасах БССР (паводле матэрыялаў абследавання 40 калгасаў БССР у 1931 г.) / Н. Фішар. – Менск: Масавы сектар і ЦБ краязнаўства, 1932. – 39 с.
5. Цэнтральны навуковы архіў Акадэміі навук Беларусі (ЦНА АНБ). – Фонд 1. – Воп. 1. – Спр. 15. Переписка Центрального бюро краеведения. Копия проекта положения Сектора массовой работы АН БССР. – 75 л.
6. Што робіцца ў раёнах па краязнаўству // Савецкая краіна. – 1932. – № 9. – С. 113.
7. Работа ЦБК у 1932 г. // Савецкая краіна. – 1933. – № 1. – С. 78–80.


*Паступіла 15.03.2011*